# Забыты некропаль

## Чаму турысты не ходзяць на гродзенскія могілкі?

**Марына ХАРЭВІЧ**

— Горад памерлых, як і горад жывых, мае свае межы, архітэктуру, сімволіку і вулачкі, якія вядуць у цэнтр, да храму, — пачынае экскурсію па старых могілках на вуліцы Антонава краявед Ігар Ламека.



Фота Сяргея Людкевіча

Апошні раз ён вадзіў тут турыстаў паўтары гады таму. На гродзенскім некропалі можна знайсці шмат цікавага, але ён пакуль не стаў турыстычным брэндам Гродна, як Лычакоўскія могілкі ў Львове, Роса у Вільні, Павонзкі у Варшаве ці Ракавіцы у Кракаве.

### Старый магілы маўчаць

— Над пахаваннем чыноўніка Якуба Памеран-"кага (1869 год) надмагілле іроблена ў выглядзе Прыгожай плакальшчыцы. Медальён знішчаны, твар скульптуры сцёрся. На надмагіллі аўтара гэтага помніка Баляслава паэткі Дануты Бічэль. Яна месціцца побач з царквой, але без дапамогі экскурса- вода заўважыць яе цяжка. Месца пахавання гарадзен- скага паэта Міхася Васілька мы знайшлі толькі з другой спробы пасля некалькіх паваротаў па могілкавых вулачках — помнік пры- крывае вялікі куст.

Многія надмагіллі, якія маглі б распавесці гісторыю га, паэта Міхася Багу- на, майстроў па камені айцоў і сыноў Качаноў ды Баляславаў Шышкевічаў. Тут пахаваныя вядомыя асобы, магілы якіх не знайшлі, — напрыклад, архітэктар Джузэппэ Сака. Ёсць цікавыя надмагіллі людзей, пра якіх нічога не вядома — як пра француза Франсуа Легрэ, што быў па- хаваны ў 1890 годзе на вы-

### Хто адказны за ахову?

На думку гісгорыка Юрыя Гардзеева, могілкі сведчаць аб гісторыі рэгіёна, аддюстроўваюць яе праз прызму лёсаў продкаў. Ад- нак гэты 200-гадовы помнік недастаткова задбаны. Ён не мае статусу гістарычнай каштоўнасці. 3 усяго комплексу ахоўваюцца толькі тры брацкія магілы. Спецыяліст прапануе ўнесці



аднаўлення і рэканструкцыі займаюцца кансерватары архітэктурнай спадчыны,

**Мова нанова з «ВГ»**

*Паходня — факел, фонарь Мапа — карта Аказіянальна — по случаю*

Шышкевіча — скульптура дзяўчыны з адбітай галавой, — Ігар Ла- мека ходзіць сярод помнікаў так, быццам завітаў да старых знаёмых.

Апошні прытулак на старым некропалі на Антонава знайшлі шмат знакамітых людзей Гродзеншчыны. Тэта прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі і духавенства, вайскоўцы і чыноўнікі. Але тым наведвальнікам, якія завітаюць сюды ўпершыню, без праваднікa арыентавацца будзе складна. Тут няма вуліцы з назвамі, указальнікаў, а крыжы і надмагільныя камяні нават вельмі вядо- мых людзей хаваюцца ў вы- сокай траве і зарасніку.

«Вось магіла Марыі Апанасаўны Багдановіч», — паказвае Ігар на незаўважны помнік. Магілу маці выдатнага беларускага паэта знайшлі з дзесятак год таму дзякуючы намаганням былых пакаленняў, стаяць заімшэлыя, са сцёртымі надпісамі, аблуплен- най фарбай. Крыжы па- ламаныя, агароджы — заіржавелыя.

## Знакамітыя жыхары «горада памерлых»

— Экскурсаводаў па могілках у горадзе вельмі мала. Пахаванні недастат- кова дагледжаныя: трава высокая, кусты засланя- юць цікавыя надмагіллі. На ўваходзе няма мапы, каб кожны мог самастой- на арыентавацца сярод пахаванняў, — аналізуе сітуацыю **намеснік дырэк- тара турыстычнай фірмы «Мерцана» Ганна Шарэн- да.**

Не кожны ведае, што могілкі на Антонава сталі апошнім прытулкам для генерала Сяргея Ланско- - хадзе з каталіцкіх могілак. 3 усяго комплексу хіба толькі магіла Элізы Ажэшкі прыцягвае наведвальнікаў, асабліва з Польшчы.

Горад памерлых цікавы не толькі славутасцямі, але і мастацкім выкананнем надмагільных помнікаў. Канец жыцця тут пера- дае згаслая паходня, дрэ- ва з абрэзанымі галінамі ды жанчына ў смутку. Ка- лоны сімвалізуюць чалаве- чае жыццё. Калі слуп завер- шаны — чалавек дажыў да старасці. Над магілай генерала Сяргея Ланскога кало- на быццам адсечаная напа- лову — ён памёр у 35 год.

Тутэйшы гістарычны помнік, Свята-Марфінская царква, асвечаная ў 1848 годзе, самая старая ў Гродне пасля Каложы праваслаўная царква, якая захавалася. найбольш даўнія гарадскія пахаванні ў ахоўны спіс комплексна: каталіцкія і праваслаўныя могілкі на вуліцы Антонава, вайсковыя на Белуша, могілкі на завулку Перамогі за Неманам, тыя, што, магчыма, размяшчаліся каля францішканскага кляштару, яўрэйскія могілкі 1789 года побач з Новым мастом на беразе Нёмана.

— Дбаць пра могілкі павінна не столькі дзяр- жава, колькі нашчадкі памерлых і супольнасці вернікаў. Хаця за мяжой для захавання ў надежным стане знакамітых комплексаў (Роса ў Вільні ці Лычакоўскіх у Львове) ства- раецца грамадскі камітэт, на дзяржаўным узроўні існуюць кантралюючыя органы. У Польшчы, напрыклад, пытаннямі захавання, якія ёсць ва ўсіх рэгіёнах краіны, таварыствы апекі над могілкамі, дабрачын- ныя фонды, якія збіраюць сродкі на іх утрыманне рэ- гулярна або аказіянальна. У Беларусі такога пакуль няма, — разважае Юрый Гардзееў.

**Загадчык участка грамадзянскага абслугоўвання ГДУПП «Спецаўтагаспадарка» Віктар Чумічоў** патлумачыў, што за пахаваннямі і тэрыторы- яй вакол іх павінны да- глядаць блізкія памерлых. Калі яны выехалі за мяжу, то могуць замовіць плат- ныя паслугі па клопаце пра могілкі. Калі сваякоў не за- сталося, за пахаваннямі не будзе даглядаць ніхто. У горадзе не' існуе адмысло- вай пасады ці органа, які б адказваў за ахову могілак — нават знакамітых людзей. Супрацоўнікі «Спецаўтагаспадаркі» прыбіраюць усю тэрыто- рыю комплекса, вывозяць смецце, косяць у летні час траву раз на месяц (на вай- сковых ды на Кургане — два разы на месяц). Перад 9 мая, 22 чэрвеня, 3 ліпеня брацкія магілы на Антонава і помнікі на вайсковых могілках мыюць ды фар- буюць, калі ёсць патрэба. У мінулым годзе за выдзе- леныя 30 мільёнаў рублёў аднавілі буйное надмагілле Сяргея Ланскога да 200-год- дзя пасля яго смерці.